


GP
gpress.info

# ДАЙДЖЭСТ
## АСВЯТЛЕННЯ ТЭМАТЫКІ ЛГБТК+ У БЕЛАРУСКІХ МЕДЫЯ

*Кастрычнік–снежань 2022 года*

Канец 2022 года ў беларускіх медыя не адзначыўся залішнім нагнятаннем ЛГБТК+ павесткі. Пэўна, з лішкам хапіла расійскага досведу прыняцця гамафобных законаў парламентам і падпісання іх т.зв. прэзідэнтам.







Вядома, усе вядучыя праўладныя СМІ ў Беларусі напісалі пра гэтую падзею, прычым навіна была нават у БелТА – дзяржаўным навінавым агенцтве.

Нейкіх канкрэтных выказванняў на гэтую тэму ў беларускім прапагандысцкім медыяполі не было. Можна выказаць меркаванне, што ідзе выпрацоўка пазіцыі.




Больш прадметна на гэтую тэму разважае гісторык Аляксандр Фрыдман.

Нельга сказаць, што медыя ў Беларусі ўвогуле абыходзілі ЛГБТК-тэматыку. Зусім не. Чаго толькі вартая памылка прапагандыстаў у адносінах да рашэння МАК наконт удзелу ЛГБТК-спартсменаў. Спроба падняць медыяпаніку з гэтай нагоды не ўдалася.




З кур'ёзаў – спроба камуністаў забараніць неіснуючы мінскі гей-клуб, дзеля жарту нанесены на Google-мапы.

Для збірання «медыяпазла» пра ЛГБТК+ у беларускіх медыя раім звярнуцца да нашых папярэдніх квартальных выпускаў дайджэста за 2022 год.
1 квартал – Рус. English.
2 квартал – Рус. English.
3 квартал – Рус. English.




З Новым годам! Спадзяемся, ён прынясе больш добрых навінаў і тэмаў.

*З павагай, рэдакцыя GayPress*

Падпісвайцеся на наш Telegram-канал!




## Беларускія праваабаронцы звярнуліся да кіраўніцтва Чырвонага Крыжа з-за гамафобных выказванняў кіраўніка БТЧК

Беларускі Хельсінкскі камітэт і Беларускі фонд медыцынскай салідарнасці звярнуліся да арганізацыяў Чырвонага Крыжа па пытанні дыскрымінацыі з боку генеральнага сакратара Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа Дзмітрыя Шаўцова.

18 кастрычніка Шаўцоў заявіў у эфіры беларускага тэлебачання, што «нетрадыцыйныя адносіны паміж паламі» з'яўляюцца «псіхічным захворваннем», якое «неабходна лячыць».

https://reform.by/338614-belarusskie-pravozashhitniki-obratilis-k-rukovodstvu-krasnogo-kresta-iz-za-gomofobnyh-vyskazyvanij-glavy-bokk



## Ці могуць у Беларусі прыняць закон пра поўную забарону прапаганды ЛГБТ, як гэта зрабілі ў РФ?

Пуцін падпісаў закон пра поўную забарону «прапаганды ЛГБТ» у Расіі, парушэнне якога для звычайных грамадзянаў выльецца ў штраф у больш за 6000 еўра. А таксама: пасадзейнічае росту дыскрымінацыі ЛГБТК+ людзей і пераследу людзей за іх сэксуальную арыентацыю і перакананні. Ці могуць такі ж закон прыняць у Беларусі? «Магчыма», – заявіў каардынатар TG House (ініцыятыва, закліканая дапамагчы трансгендарным людзям).

https://kyky.org/news/mogut-li-v-belarusi-prinyat-zakon-o-polnom-zaprete-propagandy-lgbt-kak-eto-sdelali-v-rf

GP
gpress.info

## Праўладная актывістка абвінаваціла білборд з рэкламай навушнікаў у прапагандзе ЛГБТ

Яна чамусьці назвала выяўленую на плакаце мадэль «трансгендарам» і ўгледзела ў яе знешнасці «прапаганду ЛГБТ». Праз суткі пасля скаргі ў «кампетэнтныя органы» білборд знік: яго змяніла сацыяльная рэклама.

https://news.zerkalo.io/life/23709.html?c



## Жыццё ў чужым целе. Адкрыццё душы транссэксуала

Уладзіслаў – транссэксуал, яго гендарная ідэнтычнасць супрацьлеглая ўказанаму пры нараджэнні полу. Родам ён з правінцыйнага гарадка, зараз жыве і працуе праграмістам у сталіцы.

https://minsknews.by/zhizn-v-chuzhom-tele-otkroveniya-transseksuala/




## *Касцёл – прыстанак для параненых і прыгнечаных, а не ўстанова для дасканалых. Апублікаваны Дакумент кантынентальнага этапу Сінода Біскупаў*

Сярод людзей, якія просяць пра больш актыўны дыялог і большую адкрытасць, напрыклад, былыя святары, якія спынілі служэнне, каб ажаніцца, а ў першую чаргу тыя, хто па розных прычынах адчувае напружанасць паміж прыналежнасцю да Касцёла і асабістымі афектыўнымі адносінамі. Гаворка вядзецца пра разведзеных, якія жывуць у новым шлюбным саюзе, бацькоў-адзіночак, людзей, якія жывуць у палігамным шлюбе, людзей ЛГБТК.

https://catholic.by/3/news/vatican/15154-kastsjol-prytulak-dlya-paranenykh-i-prygnechanykh-a-ne-stanova-dlya-daskanalykh-abnarodavany-dakument-kantynentalnaga-etapu-sinodu-biskupa




## *Камуністы Беларусі прапанавалі Мінгарвыканкаму перайменаваць вуліцу Каліноўскага і зачыніць начныя гей-клубы*

А таксама асаблівае абурэнне ў арганізацыі выклікае праца начных гей-клубаў – «Бурлеск» і «Гуллівы хабаток». Установы трэба ліквідаваць, паколькі «іх каштоўнасныя арыенціры несумяшчальныя з традыцыйнымі каштоўнасцямі беларускага народа». Як належыць, у лісце ўказаныя і адрасы ўстановаў.

https://reform.by/kommunisty-belarusi-predlozhili-mingorispolkomu-pereimenovat-ulicu-kalinovskogo-i-zakryt-nochnye-gej-kluby



## *На снежаньскі аўкцыён даменаў у Беларусі выставілі сайт гей-прайду і краму kilka.by*

У снежні ў Беларусі пройдзе чарговы дабрачынны аўкцыён даменных імёнаў, на якім можна набыць імёны з гісторыяй выкарыстання. Сярод навагодніх лотаў дамен гей-прайду gaybelarus.by, імя легендарнага Dial-Up правайдара 4enet і адрас kgembassy.by, раней ён належаў Амбасадзе Кыргызскай Рэспублікі.

https://belretail.by/news/na-dekabrskiy-auktsion-domenov-v-belarusi-vyistavili-sayt-gey-prayda-i-magazin-kilka-by

## *Прагматычная гамафобія Лукашэнкі*

Чаму Лукашэнка ў адрозненне ад Пуціна не педаліруе тэму барацьбы з «прапагандай ЛГБТ» і якую ролю грае гамафобія ў беларускай прапагандзе, тлумачыць гісторык Аляксандр Фрыдман.

https://www.dw.com/ru/pragmaticnaa-gomofobia-lukasenko/a-64041669?maca=rus-Red-Telegram-dwbelarus

gpress.info



## Папулярнага тыктокера са зборнай Беларусі схапілі амаль адразу пасля паходу на дзяржТБ: «пакрыўдзіў» носьбітаў формы, пачатак вайны застаў ва Украіне

Імя вам нічога не скажа, а ён жа здымае самыя папулярныя відэа ў белспорце: моцны ў сваім відзе, гуляў у халаце а-ля Міля, робіць ахоп на гей-намёках і кучы мацюкоў.

https://athletes.by/popyliarnogo-tik-tokera-iz-sbornoi-belarysi-shvatili-pochti-srazy-posle-pohoda-na-gostv-obidel-nositelei-formy-nachalo-voiny-zastal-v-ykraine.html



## Прапагандыст ад спорту павёўся на фэйк з Расіі – заявіў, што беларусаў на АГ заменяць геі і лесбіянкі, і прапанаваў іх «выраблязь»

Ужо некалькі дзён у расійскім інтэрнэце распаўсюджваецца «сенсацыйная» заява кіраўніка МАК Томаса Баха: нібыта 5 снежня функцыянер сказаў, што ў будучыні не менш за 10% складу ў камандзе кожнай краіны на Алімпійскіх гульнях павінны будуць складаць прадстаўнікі ЛГБТ.

https://by.tribuna.com/tribuna/blogs/editors/3090778-propagandist-ot-sporta-povelsya-na-fejk-iz-rossii-zayavil-chto/

## Нацыянальныя ідэнтычнасці ў 21-м стагоддзі: перспектыва для Беларусі

Дэмакратычны нацыяналізм Фукуяма называе інклюзіўным. У яго сэрцы сёння – не толькі прыхільнасць да дэмакратычных каштоўнасцяў і інстытутаў, але і павага да адрозненняў, якія людзі і супольнасці абараняюць у барацьбе супраць дыскрымінацыі. Гэтая барацьба, якая бярэ пачатак у канцы 1960-х, атрымала абазначэнне палітыкі ідэнтычнасці і знайшла выяўленне ў экалагічным, антырасісцкім, феміністкім, ЛГБТ-, антыпсіхіятрычным рухах, а таксама ў руху за правы людзей з інваліднасцю.

https://reform.by/nacionalnye-identichnosti-v-21-m-veke-perspektiva-dlja-belarusi

gpress.info



## Азаранка ажаніла свайго сябра-гея: разам адпачывалі ў пандэмію, ён і сам някепскі на корце

У нядзелю тэнісістка Вікторыя Азаранка падзялілася фатаграфіяй з вяселля, якое праходзіла ў ЗША. Вельмі нестандартнага па мерках радзімы тэнісісткі – бо шлюб быў чыста мужчынскім: яго афармляў сябар Вікторыі, адкрыты гей Джон Герыка са сваім партнёрам Томам Кларкам. Можаце сабе ўявіць такое ў Беларусі?

https://by.tribuna.com/tribuna/blogs/tennis/3090837-azarenko-zhenila-svoego-drugageya-vmeste-otdyxali-v-pandemiyu-/



## Пуцін падпісаў закон пра забарону прапаганды ЛГБТ, педафіліі і змены полу

Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін падпісаў закон пра забарону прапаганды нетрадыцыйных сэксуальных адносінаў, педафіліі і змены полу.

https://www.belta.by/world/view/putin-podpisal-zakon-o-zaprete-propagandy-lgbt-pedofilii-i-smeny-pola-538446-2022/

https://sputnik.by/20221027/paket-zakonoproektov-o-zaprete-lgbt-propagandy-prinyala-gosduma-rossii--1068427155.html

https://www.sb.by/articles/putin-podpisal-paket-zakonov-zapreshchayushchiy-propagandu-lgbt-smenu-pola-i-pedofilii.html



## Разбураецца інстытут сям'і. Што кажуць жыхары Германіі пра прапаганду ЛГБТ

Масіраваная прапаганда ЛГБТ-руху набірае абароты ў заходнім грамадстве. Пра гэта распавяла чытачка рэсурсу mlyn.by, якая жыве ў Германіі. Многія немцы нязгодныя з такой сітуацыяй, але абураюцца толькі дома за зачыненымі дзвярыма. Баяцца, што іх могуць абвінаваціць у неталерантнасці.

– ЛГБТ у Германіі лезе з усіх шчылінаў. Усе мае знаёмыя ў трывозе і смутку. Той, хто можа, з'язджае ў Беларусь і Расію. Але ў многіх на гэта проста няма сродкаў, – кажа Ганна.

https://www.pro-life.by/v-mire/razrushaetsja-institut-semi-chto-govorjat-zhiteli-germanii-o-propagande-lgbt/

## Як Беларусі ўдалося захаваць традыцыйныя каштоўнасці, не прымаючы закон супраць ЛГБТ-прапаганды

З заходнім ціскам адносна аднаполых шлюбаў і правоў ЛГБТ Беларусь сутыкнулася з першых гадоў свайго станаўлення як суверэнная дзяржава. Заходнія эліты не маглі ўпусціць магчымасці схіліць маладую краіну ў цэнтры Еўропы на свой бок і ўкараніць свае ўстаноўкі каштоўнасцяў.

https://mlyn.by/14112022/kak-belarusi-udalos-sohranit-tradiczionnye-czennosti-ne-prinimaya-zakon-protiv-lgbt-propagandy/




## Гей-парады – не нашы каштоўнасці

У лік так званых заходніх «каштоўнасцяў» уключаныя такія паскудныя паняткі, як трансгендарнасць і аднаполае каханне.

https://www.nesvizh-news.by/2022/12/12/gej-parady-ne-nashi-cennosti/

## «Я і анімэ гляджу». Якія культурныя каштоўнасці ў сучаснай моладзі?

Гэта гісторыя пра тое, што ЛГБТ і ўсё гэтае пазіцыянаванне гей-індустрыі робіцца для таго, каб паменшыць колькасць людзей, – гэта зразумела. Але давайце не будзем зводзіць нашы традыцыйныя каштоўнасці выключна да гэтых квазі-сямейных адносінаў, таму што крыху інакш уся гэтая гісторыя будуецца.

https://ctv.by/ya-i-anime-smotryu-kakie-kulturnye-cennosti-u-sovremennoy-molodyozhi




## *На дзяржТБ абмяркоўвалі беларускія культурныя каштоўнасці. Асабліва здзівіла псіхолаг*

На СТБ вырашылі абмеркаваць беларускія культурныя каштоўнасці, але ў асноўным абмяркоўвалі ЛГБТ. Паглядзелі перадачу і выбралі самыя нечаканыя і цікавыя заявы. Асабліва нас здзівілі рэмаркі псіхолага, прапагандыста і вядучых.

https://news.zerkalo.io/life/28699.html?c




## *Захад падмяняе панятак жаноцкасці. Навошта?*

Як мінімум, яны прапануюць нядбайнасць. Як максімум, дваццаць пятым кадрам, – адмову ад палавога адрознення. А значыцца, укараненне ў нашу падсвядомасць, што гомасэксуалізм – гэта здорава, бацька 1 і бацька 2 – гэта крута, а дзіця ніякага роду – гэта, наогул, пік прагрэсіўнай свядомасці.

http://lidanews.by/news/life/27301news.html



## *БЧБшнікі за мяжой. Беларус стаў хлопцам вядомага гей-б'юці блогера Пятрова*

Хачу папярэдзіць чытачоў, у гэтым артыкуле будзе вельмі шмат непрыстойнасцяў. Бо сёння гаворка вядзецца пра такую скандальна вядомую асобу, як б'юці-блогер Андрэй Пятроў. У гэтай мефедронавай істоты, якая мае самую брудную рэпутацыю ў рускамоўным інтэрнэце, з'явіўся хлопец Алег – ён з Беларусі. Скакаў тут у 2020 годзе і даскакаўся да таго, што апынуўся ва Украіне.

https://mlyn.by/23122022/bcbshniki-za-granicei-belorus-stal-parnem-izvestnogo-gey-buti-blogera-petrova/

## *Галоўны сэксолаг Мінска: калі з мяккіх і добрых хлопчыкаў вырастаюць гомасэксуалісты і чаму мужчыны ходзяць налева*

– Як вы ставіцеся да людзей з нетрадыцыйнай арыентацыяй?

– Гэта не норма. Прычыну бачу ў выхаванні, хаця існуе мноства тэорыяў.

Сёння даволі шмат дзяцей выхоўваецца ў няпоўных сем'ях, часцей маці-адзіночкамі. Хлопчык расце, мама днямі працуе, часу на дзіця няма…

Разам з тым сын расце пяшчотным, добрым хлопчыкам з мяккім характарам. Мама ганарыцца тым, што ён такі, і тым самым стварае добрую глебу для таго, каб у хлопчыка сфарміравалася трансфармацыя палавой ролі, якая дае глебу для развіцця гомасэксуаліста.

https://minsknews.by/glavnyiy-seksolog-minska-kogda-iz-myagkih-i-horoshih-malchikov-vyirastayut-gomoseksualistyi-i-pochemu-muzhchinyi-hodyat-nalevo/



## *У Гомелі прайшлі семінары па рэпрадуктыўным здароўі падлеткаў*

Медыкі даведаліся пра асаблівасці падлеткавага ўзросту – нейрафізіялагічныя, псіхалагічныя, сацыяльныя. Вывучылі, як эфектыўна ўзаемадзейнічаць з падлеткамі. Абмеркавалі вострыя тэмы ў працы з моладдзю, такія як ЛГБТК+, адмова ад нараджэння дзяцей, свабодныя сэксуальныя адносіны, знаходжанне ў пазашлюбнай сувязі.

https://www.pro-life.by/antisemejnye-tehnologii/seksprosvet/v-gomele-proshli-seminary-po-reproduktivnomu-zdorovju-podrostkov/




## *Паралімпійцы – вельмі зручная мэта для геапалітычных выпадаў*

Такім чынам, сусветная спартыўная «закуліса», пераступіўшы праз галоўны прынцып дэ Кубертэна, не пашкадавала нават інвалідаў. Для заходняга грамадства, якое славіцца прырода-, заа-, права- і ЛГБТ-абаронцамі, паралімпійцы аказаліся выдатным аб'ектом для новай атакі і мярзотнай санкцыйнай палітыкі ў цэлым.

https://sozhnews.by/news-belarus/paralimpijtsy-ochen-udobnaya-tsel-dlya-geopoliticheskikh-vypadov



## *Як трансфармуюцца сямейныя каштоўнасці ў сучасным грамадстве?*

Таксама негатыўна ўплывае на інстытут сям'і ўзмацненне прапаганды нестандартных сэксуальных адносінаў і звязаных з імі каштоўнасцяў, – лічыць Яўгенія Далімаева. – У некаторых краінах з'ява набыла пагрозлівыя маштабы. Паводле вынікаў даследавання, праведзенага ў кастрычніку 2021 года ў ЗША, 39% грамадзянаў краіны ва ўзросце ад 18 да 24 гадоў ідэнтыфікавалі сябе як прадстаўнікоў ЛГБТ-супольнасці.

https://vitvesti.by/index.php/obshestvo/kak-transformiruiutsia-semeinye-otnosheniia-v-sovremennom-obshchestve.html

## *Выратаваць дзіцячыя душы*

І на гэтую выспачку праваслаўныя амерыканцы, рускія – людзі розных нацыянальнасцяў – па нядзелях вязуць дзяцей.

Ад чаго ж яны ратуюцца?

Ад бруду, усюдыіснай амерыканскай гей-прапаганды: сама бачыла ў школах прыбіральні для дзяцей «трэцяга полу», на мясцовых цэрквах – вясёлкавыя флагі, у дзіцячых садках – урокі сэксуальнай разнастайнасці на прыкладзе картак, дзе замест мамы і таты – два дзядзі ці дзве цёці.

https://nastgaz.by/spasti-detskie-dushi/

GP
gpress.info

## Запрашаем на Gay Press

*https://gpress.info*

YouTube

Instagram

TikTok

ВКонтакте

Telegram

Яндекс.Дзен

Facebook

Twitter

E-mail: gaypresseu@gmail.com

GP

gpress.info